■ Запаведнымі сцежкамі

# Як выгадаваць глушца ў няволі?

## Не лягчэй, чым прывабіць турыста ў пушчу



Экалагічная сцежка.

Фота БЕЛТА.

**Захаваць біяразнастайнасць і прыцягнуць турыстаў — асноўныя мэты для супрацоўнікаў заказніка «Налібоцкі». Для гэтага яны разводзяць глушцоў і аленяў, а таксама дабудоўваюць інклюзіўную экасцежку.**

### ПЛАНЫ НА ГАДАВАЛЬНІК

Налібоцкая пушча — самы вялікі лясны масіў у Еўропе. Многія птушкі і жывёлы, якія насяляюць гэтыя мясціны, занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Тут жа жыве і 160 глушцоў Маера — знікаючага падвіду. На ўсю краіну іх засталося ўсяго 400 асобін, а для ўстойлівай папуляцыі столькі павінна быць толькі ў заказніку. Пакуль птушка не ахоўваецца законам, гэта значыць, што паляванне на яе дазволена. Аднак **дырэктар рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі» Васіль ГУРКОЎ** упэўнены: у пушчы ніхто паляваць на глушцоў не будзе — не тая папуляцыя, не тая колькасць.

Аднак птушак становіцца ўсё менш. Гэта прывяло супрацоўнікаў заказніка да думкі разводзіць глушцоў у няволі, а потым выпускаць у дзікую прыроду. Толькі так, на іх думку, можна аднавіць папуляцыю.

— У ідэале на працягу 5—7 гадоў мы хочам выпусціць на волю 400 птушак.



Фота БЕЛТА.

**Дырэктар рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі» Васіль ГУРКОЎ.**

І калі ўсё складзецца ўдала, то і дапамагчы нашым бліжнім суседзям. У Польшчы, Літве і Германіі глушэц Маера ў дзікай прыродзе ўжо не сустракаецца, толькі ў гадавальніках, — расказаў Васіль Гуркоў.

Каб павялічыць папуляцыю глушца, і ў нас у мінулым годзе ў заказніку «Налібоцкі» быў адкрыты гадавальнік. Грошы на яго будаўніцтва выдзелілі Еўрасаюз, ГЭФ, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання і сам заказнік. На гэтыя сродкі пабудавалі пляцоўку, набылі спецыяльнае абсталяванне і закупілі корм. Але пакуль, на жаль, ні адзін глушэц з гадавальніка ў пушчу не перасяліўся.

— У мінулым годзе мы злавілі двух самцоў і дзвюх самак, аднак патомства не атрымалі, — падзяліўся дырэктар заказніка. — У гэтым годзе мы злавілі яшчэ 22 птушкі, але з іх толькі дзве самкі. На іх мы павесілі радыёметрычныя датчыкі, каб знайсці кладкі яек. У выніку адну птушку забіў ястраб-цецеравятнік, а ад другой знайшлі дзевяць яек. Самцоў жа мы выпусцілі ў дзікую прыроду.

Па словах Васіля Гуркова, з гэтых дзевяці яек удалося атрымаць толькі тры птушаняці і толькі аднаго вырасціць. Астатнія не вытрымалі рэжыму ў брудоры (спецыяльныя камеры, дзе птушаняты абсыхаюць пасля нараджэння).

— Тэхніка новая. Пакуль мы не ведаем усіх нюансаў. Зараз плануем тэсціраваць брудор на яйках фазана, каб не паўтарыць памылку, — падзяліўся дырэктар заказніка.

Зараз у заказніку пяць птушак. Ім нават далі імёны. Самцоў завуць Гоша і Нічыпар, самак — Марына і Ларыса, а восем птушаня пакуль яшчэ без імені.





Васіль Гуркоў глядзіць на справу з аптымізмам. Ён упэўнены, што ў 2018 годзе ў іх атрымаецца цалкам укамплектаваць гадавальнік самкамі, якіх для поспеху трэба яшчэ восем, і атрымаць патомства. Наступны крок — прывучыць птушанят, узгадаваных у няволі, да дзікай прыроды. І тут ужо ёсць падыходы і задумкі. Што датычыцца пакуль адзінага атрыманага птушаняці, яно застанецца жыць у заказніку.

### ПЕРШЫЯ СПРОБЫ «ПАДЗЯЛІЦЦА» АЛЕНЯМІ

З аленямі справы ў заказніку ідуць значна лепш. Па апошніх падліках, іх тут 900. Вялікая колькасць дазваляе «дзяліцца» аленямі і з іншымі лясгасамі. Так, праз 1—3 тыдні 20 асобін павязуць у Чавускі лясгас для стварэння новай папуляцыі. Перад гэтым жывёл трымаюць у каранціне і бяруць аналіз крыві.

— Нашы алені важаць каля 280 кг, даўжыня рагоў дасягае 120 см. Ніводзін прадстаўнік гэтага віду ў краіне не мае такіх паказчыкаў, — падзяліўся дырэктар заказніка. — Сваіх аленяў мы прадаём упершыню. Ужо ёсць заяўкі ад турыстычнага комплексу «Чырвоны бор», а таксама лясгасаў Гродзенскай і Магілёўскай абласцей.

### ІНКЛЮЗІЎНАЯ СЦЕЖКА, НАВАГОДНІЯ СВЯТЫ І ФОТАПАЛЯВАННЕ

Для турыстаў у заказніку прамаркіравалі тры веламаршруты, зрабілі стаянкі для байдарачнікаў, праклалі экасцежку «Сярэбранае скрыжаванне» ў 960 метраў. А цяпер ідзе будаўніцтва другой сцежкі, якая пазіцыянуецца як інклюзіўная. Яе працягласць будзе складаць 1296 метраў. Спецыяльнае пакрыццё, альтанкі з пандусамі, стэнды з шрыфтам Брайля дазволяць наведаць Налібоцкую пушчу людзям з абмежаванымі магчымасцямі. Такая сцежка ў Беларусі пабудавана ўпершыню.

Першая ж экасцежка ў асноўным разлічана на дзяцей. Цяпер яна знаходзіцца на рэканструкцыі, але на Новы год чакае дзяцей на свята з Дзедам Марозам, Снягуркай, смачнымі блінамі з варэннем з лясных ягад і іншымі забаўкамі.

Па словах Васіля Гуркова, у Налібоцкую пушчу штогод прыязджае каля сотні турыстаў з Германіі, Польшчы, Ізраіля, Вялікабрытаніі. Многія з іх аматары фотапалявання. Фатаграфаваць жывёл здалёк дазваляюць бясплатна. Бяруць грошы толькі ў тым выпадку, калі «паляўнічы» хоча падысці бліжэй.

Таксама ў заказніку можна грунтоўна паназіраць за жывёламі. Для гэтага супрацоўнікі прапануюць турыстам аўтамабіль і паслугі егера. Разлічана праграма на цэлы дзень. А ў наступным годзе ў заказніку плануюць адкрыць пункт пракату веласіпедаў і байдарак.

**Кацярына КІРЭЕВА.**
*katyakireeva@zviazda.by*

# КОЛЕР НАДЗЕІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

***— Па якіх крытэрыях выбіралі для ўдзелу ў праекце Полацк, Наваполацк і Навагрудак?***

— Полацк і Навагрудак — адны з лідараў у кірунку ўстойлівага развіцця ў нашай краіне. Полацк першым далучыўся да Пагаднення мэраў па клімаце і энергіі, актыўна рэалізуе мерапрыемствы ў сферы паляпшэння стану навакольнага асяроддзя. Адміністрацыя горада энергічна шукае падыходы і меры па скарачэнні выкідаў. Навагрудак таксама ўзяў на сябе абавязкі скарачэння выкідаў парніковых газаў.

Наваполацк цяпер рэалізуе праекты па ўстойлівай мабільнасці і інклюзіі.

Акрамя таго, на прыкладзе малых і сярэдніх гарадоў працуем рэалізаваць пэўныя мерапрыемствы і атрымаць вынікі падчас выканання праекта.

***— На рэалізацыю гэтага праекта ПРААН выдаткавала 3 млн долараў. Ці ўдзельнічаюць у ім фінансава дзяржструктуры, мясцовыя бюджэты? Ці дастаткова сродкаў на рэалізацыю ўсіх ідэй?***

— Сродкі на рэалізацыю мерапрыемстваў выдзяляе Глабальны экалагічны фонд. Пілотныя гарады, а таксама партнёры праекта гарантуюць дадатковае фінансаванне рэалізацыі яго мерапрыемстваў. Згодна з бюджэтам праекта ў дадатак да 3 млн плануецца далучыць яшчэ 12 млн долараў. Сродкаў дастаткова для рэалізацыі запланаваных мерапрыемстваў, але ж для вырашэння праблем гарадоў неабходзны дадатковыя сродкі.

***— Ці задаволены вы супрацоўніцтвам, якое складваецца з дзяржаўнымі арганізацыямі і органамі мясцовай улады?***

— Дзейнасць па праекце каардынуецца як з боку Праграмы развіцця ААН, так і з боку Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, якое з'яўляецца выконваючай арганізацыяй па праекце. Трэба адзначыць, што пілотныя гарады падтрымліваюць праект і актыўна дапамагаюць як у арганізацыі мерапрыемстваў, так і ў рэалізацыі яго пэўных кампанентаў. Наколькі больш актыўна мясцовыя ўлады сталі далучацца да «зялёных» ініцыятыў, відаць на прыкладзе Еўрапейскага тыдня мабільнасці (The European Mobility Week), які прайшоў пры інфармацыйнай падтрымцы нашага праекта з 16 па 22 верасня. Мэта гэтай штогадовай еўрапейскай кампаніі — паказаць жыхарам гарадоў і гарадскім адміністрацыям перавагі выкарыстання экалагічных відаў транспарту, ступень уздзеяння шкодных выкідаў аўтатранспарту на грамадскае здароўе. Актыўнасць беларускіх гарадоў уразіла: калі ў 2015 годзе ў ЕТМ удзельнічалі толькі Мінск, Полацк і Наваполацк, то ў 2016-м гарадоў было ўжо 19, а ў 2017-м удзельнікамі сталі 47 гарадоў і іншых населеных пунктаў. Дарэчы, кампанія прайшла пры актыўнай падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

***— Якія ідэі звязваеце з удзелам у Месячніку «разумных» гарадоў?***

— Для праекта мы шукалі ініцыятывы з цікавымі ідэямі для рэалізацыі ў нашых гарадах. Гарады — асноўныя крыніцы выкідаў парніковых газаў. У той жа час гарады і іх таленавітыя жыхары — гэта крыніцы ідэй, інавацыйных падыходаў, цікавых праектаў і эксперыментаў, якія дапамагаюць вырашаць экалагічныя праблемы.



Экалагічныя ініцыятывы нельга адкладаць на заўтра, іх трэба ажыццяўляць ужо цяпер, а пытанні забруджвання навакольнага асяроддзя і змены клімату павінны станавіцца важнай часткай стратэгічных дакументаў развіцця гарадоў. У рамках Smart Cities Month праект падтрымаў правядзенне Кліматона. Гэты хакатон («форум распрацоўшчыкаў») па праблемах змены клімату адбыўся адначасова ў буйных гарадах свету 27—29 кастрычніка. У фінале мінскага хакатона прынялі ўдзел восем каманд, якія прадставілі свае «зялёныя» распрацоўкі па самых розных кірунках: вырошчванне дрэў у гарадах, эфектыўнае выкарыстанне гарадскіх прастораў, збор смецця, пошук працы людзьмі з інваліднасцю і г. д. Пераможцам была прызнана каманда SG Team з праектам Solarfield — мабільнай праграмай, якая вывучае мэтазгоднасць і эфектыўнасць уладкавання сонечных панэляў на дахах гарадскіх дамоў.

***— У праект плануецца ўключыць яшчэ дзесяць гарадоў Беларусі. Па якіх крытэрыях іх будуць выбіраць або, можа, падкажам актывістам, якія крокі трэба зрабіць, каб удзельнічаць у праекце?***

— На дадзены момант пакуль не вырашана наконт крытэрыяў адбору гарадоў. Мы актыўна запрашаем адміністрацыі населеных пунктаў да ўдзелу ў адукацыйных мерапрыемствах, але не заўсёды знаходзім водгук. Бо пакуль гарадскія адміністрацыі заклапочаны вырашэннем надзённых праблем і проста не маюць магчымасцяў для таго, каб больш шырока глянуць на стратэгічныя пытанні, звязаныя з гарадскім развіццём. Тым не менш у гэты спіс трапяць самыя актыўныя гарады, якія не проста зацікаўлены атрымаць фінансаванне, але і гатовыя свядома рухацца ў «экалагічным» кірунку і пры гэтым выконваць пэўныя мерапрыемствы.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
*yanovskaya@zviazda.by*